# Народная Асвета

10/1998

# ПЕРШАЕ Ў ЕЎРОПЕ

***В. С. БОЛБАС,***
***загадчык кафедры педагогікі***
***Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута,***
***кандыдат педагагічных навук***

У гісторыі цывілізацыі адным з найярчэйшых перыядаў, які даў магутны штуршок развіццю адукацыі, навукі і культуры, была эпоха Асветніцтва. У XVIII ст. са стварэннем зусім новых відаў прамысловасці ветніцтва патрабаваўся ўздым адукацыйнага ўзроўню шырокіх слаёў насельніцтва. З іншага боку, пад уплывам ідэй французскай асветніцкай філасофіі ідэалізуецца роля асветы ў жыцці грамадства. Ядром ідэалогіі Асветніцтва з'яўляецца перакананне аб рашаючай ролі ведаў у выпраўленні сацыяльных адносін, стварэнні ідэальнага чалавечага супольніцтва. Галоўная прычына няшчасцяў людзей бачылася ў невуцтве, цемрашальстве. Надзеі грамадскага ўладкавання ўскладаліся на адукацыю і выхаванне. Нездарма гэты перыяд называюць «векам розуму» («l'age de la raison»).

Выразна праявы эпохі Асветніцтва на Беларусі назіраюцца з другой паловы XVIII ст. побач з працэсам генезісу капіталістычных адносін, калі на аснове распаўсюджвання навуковых ведаў фарміруецца новы філасофскі светапогляд, прапаведуецца прыярытэт асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы. Уласна эпоха Асветніцтва на землях Бацькаўшчыны бярэ пачатак з адукацыйных рэформ Рэчы Паспалітай, якія былі арганізаваны першым у Еўропе Міністэрствам асветы — Адукацыйнай (Эдукацыйнай) камісіяй. Адукацыйная камісія («Kommissya edukacyjna») уяўляла вышэйшы заканадаўчы і выканаўчы дзяржаўны орган у галіне асветы. Яна была створана ў кастрычніку 1773 г. сеймам у Варшаве. На гэты час, пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772), да Расійскай імперыі была далучана толькі ўсходняя частка Беларусі з гарадамі Гомель, Рагачоў, Віцебск, Полацк і Магілёў. Астатнія ж тэрыторыі беларускіх зямель у складзе Вялікага княства Літоўскага ўваходзілі ў той час у Рэч Паспалітую. Менавіта там і пачалі адбывацца рэфармацыйныя пераўтварэнні, арганізаваныя Адукацыйнай камісіяй.

На той час істотным фактарам, які стрымліваў развіццё асветы, была залежнасць школы ад царквы як у арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу, так і ў вызначэнні яго зместу. Радыкальным крокам дзейнасці камісіі ў гэтым напрамку было адхіленне духавенства ад кіраўніцтва асветай. Упершыню ў Еўропе дзяржава праз Адукацыйную камісію непасрэдна брала ў свае рукі кіраўніцтва навучальнымі установамі. Камісія дамаглася на заканадаўчым узроўні адмежаваць царкву ад школы. У навучальных установах забаранялася выкладанне тэалогіі. Як адзначае Я. Крыжаноўскі, школьны прапаведнік выкладаў Закон Божы па-за сценамі навучальнай установы па нядзелях і святочных днях [3. С. 321]. У навучальныя планы ўводзіліся дысцыпліны прыродазнаўчага накірунку. Змест выкладаемых прадметаў узбагачаўся практычна карыснымі для жыцця ведамі.

Трэба адзначыць, што свецкая арыентацыя адукацыі ні ў якім разе не азначала атэістычнай яе скіраванасці, хаця і ствараліся для таго пэўныя перадумовы. З гэтай нагоды інспектары школ з трывогай паведамлялі, што асобныя настаўнікі ігнаруюць богаслужэнні, рэдка з'яўляюцца на споведзі. Вось што пісаў наконт гэтага архіепіскап Рачынскі: «Святая католическая вера и ея ученіе терпить презреніе и униженіе. Молодежь обосновываеть свои знанія на осмеяніи костельныхъ обрядовъ, на кощунстве и осмеяніи таинствь веры и открыто этим похваляется... среди школьныхъ учителей заняли места свободомыслящіе... Неть приказанія учить въ школахъ начаткамъ св. веры» [2. С. 30].

Наогул жа, на думку рэфарматараў, вывучэнне навук аб прыродзе не можа ісці на шкоду рэлігіі. Яно павінна быць скіравана на разумнае выкарыстанне тварэнняў рук боскіх дзеля працвітання айчыны. Дакладней кажучы, вывучэнне рэлігіі ў тым аб'ёме, як было дагэтуль, камісія паспрабавала замяніць выхаваннем у рэлігійным духу, захаваўшы ў асвеце самыя элементарныя звесткі аб хрысціянскай рэлігіі, якія былі неабходны для ўдзелу ў богаслужэннях і выкананні царкоўных абрадаў. Такое навучанне праводзілася толькі ў I і II класах па паўгадзіны ў нядзельныя і святочныя дні. Пасля абеду ў гэтыя ж дні вучні слухалі чытанні са Свяшчэннай гісторыі. Затое кожны дзень перад заняткамі ў 7 гадзін раніцы вучні ўсіх класаў павінны былі збірацца на літургію ў касцёл, а таксама раз у месяц прыходзіць на споведзь.

У склад Адукацыйнай камісіі першапачаткова ўвайшлі вядомыя грамадскія і педагагічныя дзеячы: віленскі епіскап I. Масальскі (старшыня камісіі), полацкі епіскап Панятоўскі, гнезненскі ваявода Сулкоўскі, літоўскі падканцлер I. Храптовіч, літоўскі пісар I. Патоцкі, генерал падольскіх зямель А. Чартарыйскі, ардынат А. Замойскі. Сакратаром камісіі быў зацверджаны Г. Пірамовіч. Ініцыятарам стварэння камісіі быў вядомы педагог, рэфарматар піярскіх школ С. Канарскі. Дарэчы, камісіяй быў плённа выкарыстаны вопыт рэфарміравання піярскіх школ, які ажыццяўляўся дагэтуль С. Канарскім. У дзейнасці камісіі актыўны ўдзел прынялі вядомыя асветнікі Я. Снядэцкі, Г. Калантай, К. Норбут, М. Пачобут і іншыя.

З мэтай стварэння адзінай зладжанай сістэмы асветы дзяржава дзялілася на 10 навучальных акруг, чатыры з якіх былі ў Вялікім княстве Літоўскім. На беларускіх землях створаны тры навучальныя акругі: Літоўская, Руская і Польская з цэнтрамі адпаведна ў Гродне, Навагрудку і Брэсце. Акрамя гэтага, існавала асобная піярская навучальная акруга, куды ўваходзілі піярскія школы, размешчаныя па ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Кожная акруга мела ўпарадкаваную сістэму навучальных устаноў трох узроўняў — пачатковага, сярэдняга і вышэйшага.

Пачатковую адукацыю давалі парафіяльныя школы, адкрыццё якіх прадугледжвалася ва ўсіх гарадах і мястэчках як за кошт дзяржавы, так і на сродкі фундатараў. Сваю дзейнасць парафіяльныя школы абавязаны

былі будаваць у адпаведнасці з «Палажэннем аб парафіяльных школах», выдадзеным у 1774 г. Згодна з дакументам, настаўнікі пачатковых школ павінны былі больш увагі ўдзяляць чытанню, пісьму, арыфметыцы, ажыццяўляць сувязь ведаў з жыццём, навучаць асновам сельскай гаспадаркі і рамяства, забяспечыць роўнасць правоў усіх слаёў насельніцтва на атрыманне адукацыі. У задачу гэтых школ уваходзіла распаўсюджванне пісьменнасці, асветы ў рэлігійным накірунку, узбраенне ведамі, неабходнымі для пэўнай саслоўнай прыналежнасці, канкрэтных заняткаў і рамёстваў. Падкрэслівалася практычная арыентаванасць ведаў, якія набывалі вучні ў школе. У дзяцей фарміравалі пэўныя працоўныя навыкі. Знаёмілі з асновамі гігіены і фізічнай культуры.

Статут прадугледжваў адкрыццё двух тыпаў парафіяльных школ: павышаных (у гарадах) і ніжэйшых (у мястэчках). У парафіяльных школах павышанага тыпу павінны былі выкладацца: хрысціянская навука, навука нораваў, чытанне, пісьмо, арыфметыка, пачаткі геаметрыі, навука аб агародніцтве і земляробстве, «асновы захавання здароўя» і інш. У главе 22 Статута ўказвалася, што ў ніжэйшых парафіяльных школах, «у якіх звычайна вучацца толькі вясковыя дзеці, гэтыя навукі выкладаюцца ў некалькі зменшаным аб'ёме прыстасавана да мясцовых умоў» [3. С. 280].

Метадычныя рэкамендацыі скіроўвалі ўвагу настаўнікаў на арганізацыю навучання ад простага да складанага. Падкрэслівалася, што залог поспеху — у нагляднасці і даступнасці для вучняў вывучаемага матэрыялу. Прапаноўвалася абапірацца на вопыт навучэнцаў. Асаблівая ўвага надавалася маральнай асвеце. Дысцыпліна павінна будавацца не на сляпой паслухмянасці, а на ўсвядомленых вучнямі паводзінах.

Згодна з рознымі крыніцамі, у ВКЛ у 1777 г. налічвалася каля 400 пачатковых школ, у якіх навучалася звыш 5 тыс. вучняў. Дзеці шляхты складалі каля 20 % ад агульнай колькасці навучэнцаў [5. С. 166].

Сярэднюю адукацыю давалі ваяводскія і павятовыя школы. Дзейнасць гэтых школ рэгламентавалася выдадзенымі ў 1774 г. «Правіламі Камісіі Народнай адукацыі для школ ваяводскіх» [6. С. 18—19] і інструкцыяй «Парадак і сістэма навук у школах ваяводскіх» [6. С. 31—51]. У канцы 70-х гг. ВКЛ налічвала звыш 35 сярэдніх школ, сярод якіх 8 належалі ордэну піяраў, 2 — базыльянам, 2 — дамініканцам, 2 — рэфарматарскаму сіноду. У кожнай акрузе ў якасці вядучай вылучаецца па адной акруговай школе, астатнія школы лічыліся падакруговымі.

Такім чынам, на беларускіх землях функцыяніравалі адпаведна Гродзенская акруговая школа і падакруговыя школы ў Барунах, Ваўкавыску, Вішнёве і Паставах; Навагрудская акруговая школа і падакруговыя ў Бабруйску, Беразвеччы, Мазыры, Мінску, Нясвіжы, Слуцку, Халопенічах; Брэсцкая акруговая школа і падакруговыя ў Жыровічах і Пінску. Акрамя гэтага, школы сярэдняй ступені ў Драгічыне, Лідзе, Лужках і Шчучыне ўваходзілі ў асобную піярскую навучальную акругу.

Акруговыя школы былі шасцікласнымі, з сямігадовым тэрмінам навучання. Падакруговыя — трохкласнымі, з шасцігадовым тэрмінам навучання. У акруговых школах толькі ў V класах тэрмін навучання доўжыўся 2 гады, у астатніх — па году, у падакруговых усе класы былі з двухгадовым тэрмінам навучання. Навучальны год у гэтых школах пачынаўся 29 верасня і без канікул працягваўся поўныя 10 месяцаў аж да 29 ліпеня. Перад пачаткам заняткаў у 7 гадзін раніцы ўсе вучні маліліся ў касцёле. Штодзённа, акрамя аўторка і чацвярга, у школьнікаў было 4 урокі, а ў аўторак і чацвер — 2. Пасля класных заняткаў вучні рыхтавалі дамашнія заданні, выконвалі даручэнні настаўнікаў, займаліся хатнімі справамі. У аўторак і чацвер пасля абеду пад кіраўніцтвам прэфекта ці настаўніка арганізоўваліся прагулкі ў лес, дзе наладжвалі спаборніцтвы, гульні, ішло азнаямленне з навакольным светам. У 9 гадзін вечара дзеці клаліся спаць.



У штат акруговых школ уваходзілі рэктар, прэфект, шэсць настаўнікаў, прапаведнік і два настаўнікі замежных моў. У падакруговых — прарэктар, тры настаўнікі, прапаведнік і настаўнік замежных моў. У акруговай школе ў першым і другім класах быў адзін настаўнік, у старэйшых — настаўнікі-прадметнікі. У школы залічваліся ўсе жадаючыя, але яны павінны былі ўжо ўмець чытаць і пісаць. У першым класе акруговых школ прадугледжвалася вывучэнне арыфметыкі (да дробаў), граматыкі (склоны і спражэнні), маралі (абавязкі дзяцей у адносінах да бацькоў, настаўнікаў і таварышаў), пачаткаў геаграфіі і натуральнай гісторыі. Пісьмовыя практыкаванні, акрамя чыстапісання, забараняліся. Вусныя практыкаванні засяроджваліся на правільным вымаўленні, якое павінна было быць «моцным, роўным, выразным і прыстойным».

У другім класе працягваліся гэтыя ж навукі: граматыка з агульнымі правіламі сінтаксісу, арыфметыка да трайнога правіла, натуральная гісторыя завяршалася батанікай, мараль аб адносінах слуг да паноў і наадварот, аб добрых і дрэнных учынках і г. д. У падакруговых школах усё гэта праходзілі за 1 год. У наступных класах выкладалі настаўнікі-прадметнікі. Лік вучняў, якія прадстаўлялі сярэднія ці ніжэйшыя слаі грамадства, у гэтых школах ужо не дасягаў 25 % ад агульнай колькасці навучэнцаў сярэдніх школ. У кожнай са школ за кошт сродкаў Адукацыйнай камісіі вучылася некалькі здольных вучняў з бедных сямей. Яны забяспечваліся бясплатнымі кватэрамі, харчаваннем, адзеннем і падручнікамі.

Змест і метады навучання ў школах сярэдняй ступені яшчэ ў большай меры былі падвергнуты рэфарміраванню. Канфесійны тып школы з граматыка-рытарычным ухілам быў заменены на школу свецкага накірунку, аснову якой складалі прыродазнаўчыя і дакладныя навукі. «Правілы» абгрунтоўвалі і ўстанаўлівалі пералік абавязковых прадметаў, на якія адводзілася 20 гадзін у тыдзень. У змест навучання ўваходзілі арыфметыка, алгебра, геаметрыя, трыганаметрыя, фізіка, геаграфія, астраномія, гісторыя, эканоміка, польская і лацінская граматыкі, маральная навука, заканадаўства, логіка, рыторыка і іншыя. Асобныя прадметы і іх змест былі размеркаваны па гадах навучання.

З мэтай павышэння эфектыўнасці навучання рэкамендавалася шырока выкарыстоўваць назіранні, доследы, эксперыменты. Акцэнтавалася ўвага на ўлік індывідуальных асаблівасцей вучняў, на стварэнне добразычлівых, паважлівых узаемаадносін настаўнікаў і вучняў. У працівагу панаваўшым дагэтуль схаластыцы і зубрэнню асноўны акцэнт робіцца на развіццё мыслення ў вучняў. «Вообще учители стараться имеют, дабы ученики более успевали рассуждениями, нежели изучением предметов наизусть» [1. С. 116], — раіў Статут Адукацыйнай камісіі. Рабіліся практычныя захады па ўмацаванню навучальнай базы школы. Пры многіх школах арганізоўваліся бібліятэкі, лабараторыі, музеі. Асобныя школы мелі ўласныя батанічныя сады, доследныя ўчасткі, кабінеты прыроды, калекцыі прадстаўнікоў раслiннага і жывёльнага свету.

Вышэйшую ступень адукацыі ў Вялікім княстве Літоўскім прадстаўляла Віленская акадэмія, якая ў ходзе рэформы была пераўтворана ў

Галоўную школу Вялікага княства Літоўскага («Szkoła główna»). Гэтая ўстанова адначасова з'яўлялася навуковым і навучальным цэнтрам, ажыццяўляла метадычнае і арганізацыйна-адміністрацыйнае забеспячэнне дзейнасці навучальных устаноў. У ёй захоўваліся чатыры факультэты: багаслоўскі, філасофскі з матэматычнымі навукамі, медыцынскі і юрыдычны. Для кіраўніцтва навуковым і навучальным працэсамі былі створаны дзве калегіі: а) фізічных навук (медыцыны, прыродазнаўства, матэматыкі); б) маральных навук (тэхналогіі, філасофіі, гісторыі, літаратуры і права). У калегіі ўваходзілі ўсе выкладчыкі адпаведных прадметаў. Рэктар школы выбіраўся на савеце, які прадстаўлялі ўсе прафесары, дэпутаты ад студэнтаў усіх факультэтаў і нават вучняў сярэдняй школы, якая існавала пры акадэміі.

Адным з найважнейшых вынікаў работы камісіі была распрацоўка галоўнага нарматыўнага дакумента — «Статута, падпісанага камісіяй народнай асветы для акадэмій і школ Рэчы Паспалітай», які вызначаў мэты і сутнасць рэформы адукацыі. Сама падрыхтоўка гэтага дакумента ўяўляла ўзор дэмакратычнага падыходу да арганізацыі радыкальных змен у галіне асветы. Праект Статута быў падрыхтаваны Г. Пірамовічам у 1782 г. Ён адлюстроўваў усе задумы і першыя крокі дзейнасці Адукацыйнай камісіі па стварэнню сістэмы асветы. Пасля гэтага больш за год праводзяцца праверкі дзейнасці школ, на месцах узгадняюцца асобныя палажэнні праекта, фіксуюцца заўвагі педагогаў і грамадскасці. Пасля завяршэння такой работы была ўтворана асобная камісія пад старшынствам І. Патоцкага, якая на працягу 6 тыдняў на штодзённых пасяджэннях вывучала атрыманыя матэрыялы, абмяркоўвала кожны пункт будучага дакумента. Вынікам працы з'явілася выданне Статута ў 1783 г.

На той час гэта быў адзіны ў Еўропе дакумент, які паказваў месца школы ў жыцці дзяржавы і грамадства. Ён складаўся з 25 раздзелаў, у якіх вызначаліся прынцыпы арганізацыі асветы, сродкі ўтрымання школ, змест, формы і парадак арганізацыі навучання. Статут рэгламентаваў правы і абавязкі настаўнікаў і вучняў, уводзіў пасады візітатараў. Для многіх краін, у тым ліку і для Расіі, Статут з'явіўся ўзорам распрацоўкі ўласных аналагічных дакументаў. Многія гады ён быў прадметам пільнага вывучэння як прыхільнікаў, так і крытыкаў дакумента.

Адной з умоў выніковасці распрацаваных рэформ было прыцягненне незалежных ад афіцыйнай царквы крыніц фінансавання асветы. Год стварэння Адукацыйнай камісіі якраз супадае з годам, калі быў скасаваны адзін з найбольш магутных і ўплывовых манаскіх ордэнаў — езуіцкі. Прынамсі, з'яўленне ў жніўні 1773 г. булы папы рымскага Клімента XIV аб спыненні дзейнасці ордэна з'явілася штуршком для стварэння Адукацыйнай камісіі. Патрэба ў рэфармаванні асветы наспела ў дзяржаве ўжо даўно, але ж неабходнасць штосьці рабіць з шырока разгалінаванай сеткай езуіцкіх навучальных устаноў прыспешыла гэты працэс. Пастановай сейма ўся маёмасць ордэна, у прыватнасці школы, пераходзіла ў спецыяльны фонд, прызначаны для адукацыі і выхавання юнацтва. На гэтым жа сейме для падзелу маёмасці экс-езуітаў былі ўтвораны размеркавальныя камісіі: адна для Кароны, другая для ВКЛ. А таксама для вырашэння спрэчных пытанняў зацверджаны судовыя камісіі.

Маёмасць і землі забароненага ордэна давалі істотныя фінансавыя сродкі, так званыя паезуіцкія даходы, якія сталі асноўнай крыніцай



фінансавання школ, што павінны былі працаваць у адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі Адукацыйнай камісіі. Але, як сведчаць факты, пры размеркаванні і выкарыстанні такіх сродкаў часта мелі месца злоўжыванні, якія пагаршалі і без таго недастатковае матэрыяльнае забеспячэнне школ. У 1776 г. сейм звярнуў увагу на несумленныя адносіны некаторых афіцыйных асоб да вырашэння пытанняў выкарыстання паезуіцкай маёмасці. Ён даручыў Адукацыйнай камісіі пракантраляваць гэты ўчастак спраў і аддаў ёй усю паўнату ўлады для навядзення фінансавага парадку. Размеркавальныя і судовыя камісіі былі скасаваны. Пасля прынятых мер даходы камісіі ўзраслі з 300 тыс. да 2 млн 311 тыс. злотых. Дзякуючы намаганням членаў камісіі, практычна за 20 гадоў свайго існавання на беларускіх землях адкрыты школы сярэдняй ступені ў Бабруйску, Брэсце, Ваўкавыску, Вішнёве, Гародні, Жыровічах, Ігумене, Драгічыне, Лідзе, Лужках, Мазыры, Навагрудку, Нясвіжы, Паставах, Пінску, Халопенічах і інш.

У Статуце, акрамя адукацыйных, ставіліся і выхаваўчыя задачы. Найважнейшым лічылася выхаванне адданых айчыне грамадзян. У змест многіх гуманітарных прадметаў уключаўся матэрыял, які садзейнічаў фарміраванню нацыянальнай свядомасці. Сур'ёзная ўвага надавалася вывучэнню польскай граматыкі. Навучальныя кнігі былі, як правіла, на польскай мове. У дачыненні да беларускага вучнёўства ўсё гэта азначала прамое і непасрэднае апалячванне, што, дарэчы, з'яўлялася арганічнай састаўной часткай нацыянальнай палітыкі кіруючых колаў Рэчы Паспалітай.

Рэфарматары асветы клапаціліся, каб усё школьнае навучанне было прасякнута выхаваўчым духам. Асаблівая ўвага ўдзялялася маральнаму выхаванню, якое нават ставілася вышэй за разумовае. На кожным уроку настаўнік павінен быў выхоўваць вучняў словам і ўласным прыкладам. Аналізуючы выхаваўчыя накірункі школьнай адукацыі, што распрацоўваліся Адукацыйнай камісіяй, Я. Крыжаноўскі прыводзіць наступныя вытрымкі з адпаведнай інструкцыі камісіі: «Знаніе, сведеніе само по себе не имеет никакого значенія, если оно не служить всецело возбужденію добрыхъ инстинктовъ, къ утвержденію ученика во всех добродетеляхъ, необходимых для его личнаго и общаго счастія. Иначе лучше вовсе не иметь школьнаго образованія» [3. С. 448]. Для выкладчыкаў асобных прадметаў распрацаваны адпаведныя рэкамендацыі, як развіваць дабрачыннасць праз вывучэнне канкрэтных навук. Падкрэслівалася, што па-рознаму павінен быць арганізаваны выхаваўчы працэс для сялянскіх дзяцей і дзяцей шляхты. Засяроджвалася ўвага на тым, што любоў да бліжняга, жаданне працаваць і іншыя дабрачыннасці лепш за ўсё можна выхаваць праз прывучэнне, практычныя карысныя справы.

У рэчышчы падрыхтоўкі самаадданых абаронцаў айчыны вялікая ўвага надавалася і фізічнаму выхаванню. Статут акцэнтаваў увагу на ваеннай падрыхтоўцы. Там запісана, што «ўласцівымі шляхецкай моладзі павінны лічыцца практыкаванні, якія заключаюцца ў салдацкай выпраўцы, у штурме або абароне якой небудзь мясціны.., (абучэнні) ваеннаму строю, парадку і ваеннаму закону... Такім чынам непадзельнае фізічнае і маральнае выхаванне здольна будзе даць айчыне паважных людзей і добрых грамадзян» [4. С. 87—88].

Новая сістэма адукацыі прадугледжвала істотныя змены і ў методыцы навучання. Статут Адукацыйнай камісіі і выдадзеныя ёй «Правілы»

патрабавалі ад настаўнікаў выкарыстання такіх метадаў навучання, якія б выкаранялі са школы схаластыку і зубрэнне. Рабіўся акцэнт на развіццё мыслення вучняў. Вялікая ўвага надавалася нагляднасці, уліку ўзроставых асаблівасцей дзяцей пры арганізацыі навучання. Указвалася на недапушчальнасць перагрузкі вучняў дамашнімі заданнямі. Падкрэслівалася неабходнасць гуманных адносін да дзяцей.

Была распрацавана сістэма заахвочванняў лепшых навучэнцаў і пакаранняў парушальнікаў вучнёўскіх абавязкаў. За выдатныя поспехі і прыкладныя паводзіны вучні ўзнагароджваліся блакітнымі і чырвонымі кукардамі, якія насілі на капелюшах, кнігамі, навучальнымі прыладамі, прыняццем на дзяржаўнае ўтрыманне. Лепшыя з лепшых узнагароджваліся залатымі і сярэбранымі медалямі.

Для парушальнікаў школьных парадкаў шырока выкарыстоўваліся такія меры пакарання, як папярэджанне, асуджэнне, вымова, паведамленне бацькам і інш. Калі гэта не дапамагала, то вучня маглі паставіць на калені ў класе або выставіць у калідор з шыльдачкай у руках, дзе было напісана «Гультай» ці «Непаслухмяны» і да т. п. Фізічныя пакаранні ўжываліся за распусныя паводзіны, непадпарадкаванне кіраўніцтву школы, п'янства і крадзеж. За такія ж учынкі вучань мог быць выключаны са школы, але толькі па рашэнню школьнага суда і пры абавязковым зацвярджэнні рэктарам ці візітатарам.

Пры ажыццяўленні распрацаваных Адукацыйнай камісіяй рэформ востра адчуваўся недахоп настаўніцкіх кадраў. Многія школы працавалі з няпоўным камплектам настаўнікаў. На выкладчыцкую працу былі вымушаны запрашаць настаўнікаў з ліквідаваных езуіцкіх навучальных устаноў і школ іншых манаскіх ордэнаў. Так, напрыклад, у павятовай падакруговай школе ў Барунах з васьмі выкладчыкаў толькі настаўнік замежных моў быў свецкі грамадзянін, астатнія — ксяндзы базыльянскага ордэна. Многія з настаўнікаў дарэформеннага перыяду ігнаравалі распараджэнні камісіі, працавалі па-старому.

Камісіяй былі зроблены пэўныя захады па падрыхтоўцы новых педагагічных кадраў. Для сярэдніх школ настаўнікаў рыхтавала Галоўная школа ў Вільна. З 1775 г. для забеспячэння настаўнікамі парафіяльных школ каля Вільна адкрываецца настаўніцкая семінарыя з колькасцю навучэнцаў да 30 чалавек. І хаця даследчыкі адзначаюць нядрэнную падрыхтоўку выпускнікоў семінарыі, гэта не магло вырашыць усю кадравую праблему.

Рэфарматары разумелі, што новы настаўнік павінен быць ключавым звяном асветных пераўтварэнняў. Таму ў нарматыўных дакументах гэтаму пытанню надаецца першачарговая ўвага. Члены камісіі хацелі сфарміраваць у дзяржаве новае, асобнае, саслоўе настаўнікаў, прадстаўнікі якога павінны ўсё сваё жыццё прысвяціць прафесіянальнаму прызванню. Настаўнікам катэгарычна забаранялася займацца любымі іншымі відамі дзейнасці. Яны павінны былі насіць спецыяльны строгі касцюм, жыць абшчынна ў школе, мець пры харчаванні агульны стол (за выключэннем тых, хто меў сям'ю). На ўсіх настаўнікаў школы стваралася агульная грашовая каса — на харчаванне, прыслугу, медыкаменты і іншыя патрэбы. Падобнымі мерамі хацелі дабіцца фарміравання адзінства поглядаў і дзеянняў педагогаў, што магло забяспечыць поспех у навучанні і выхаванні вучняў. Існаваў нават асобны настаўніцкі суд з закрытым тайным галасаваннем, на якім за пэўныя ўчынкі маглі падвергнуць хатняму арышту, штрафу, пазбавіць права голасу на савеце і г. д.



Прадугледжвалася, каб настаўніцкая праца была адной з самых высокааплачваемых. Рэктар школы атрымліваў 1800 злотых, настаўнік — 1200. Акрамя гэтага, настаўнікі павялічвалі свой заробак асобнымі заняткамі з некаторымі вучнямі па дамоўленасці з бацькамі за дадатковую плату. Пасля 20 гадоў работы ў школе педагог могісці на пенсію, якая складала 2/3 яго заробку. Калі ж пасля дваццацігадовай выслугі хтосьці заставаўся працаваць у школе, то ён атрымліваў званне заслужанага настаўніка і да заработнай платы дабаўлялася 1000 злотых. За асаблівыя поспехі ў працы настаўнікам скарачаўся тэрмін выслугі гадоў для атрымання пенсіі.

Акрамя гэтага, настаўнікам налічвалі працэнты з даходаў маёмасці Адукацыйнай камісіі, і часам яны ў 5—10 разоў перавышалі яго службовы аклад. За гэта ад настаўніка патрабавалася, каб ён усе свае сілы і клопаты скіроўваў на навучанне і выхаванне школьнікаў. Ён павінен быў пастаянна пашыраць свой кругагляд, добра ведаць навучальныя дысцыпліны, дасканала валодаць методыкай іх выкладання, ведаць побыт і норавы прадстаўнікоў усіх слаёў насельніцтва, замяняць вучням іх бацькоў.

Радыкальныя змены зместу навучання патрабавалі новых школьных праграм і адпаведных кніг і падручнікаў. З гэтай нагоды ў 1775 г. створана Таварыства для выдання падручнікаў, якое праіснавала да 1792 г. У навучальныя планы замест тэалагічных і часткова філалагічных навук уводзіліся прыродазнаўчыя дысцыпліны і дакладныя навукі. Таварыства падрыхтавала і выдала новыя падручнікі па арыфметыцы, алгебры, геаметрыі, логіцы, фізіцы, прыродазнаўчых навуках. Прычым падручнікі рыхтаваліся на конкурснай аснове. Усяго выдадзены 22 найменні падручнікаў, многія з якіх шматразова перавыдаваліся. Акрамя гэтага, створана некалькі навучальных дапаможнікаў для настаўнікаў.

Адукацыйнай камісіяй была распрацавана сістэма кантролю за ажыццяўленнем намечаных мерапрыемстваў. Ніжэйстаячыя навучальныя ўстановы падпарадкоўваліся вышэйстаячым. Акрамя гэтага, распрацавана сістэма рэвізій (візітацый) школ. Першыя візітатары з'явіліся ў 1774 г. У перыяд з 1782 па 1792 г. візітацыі арганізоўваліся кожны год. Абагульняючы вынікі рэвізій школ, камісія мела магчымасць зрабіць дакладны аналіз стану спраў і рэгуляваць ход рэформ.

Шырокая сістэма кантролю ўкаранялася непасрэдна ў дзейнасць школ усіх узроўняў. Кіраўніцтва навучальных устаноў было надзелена вялікімі паўнамоцтвамі. У той жа час саветы школ мелі моцныя рычагі ўздзеяння нават на рэктара ў выпадку парушэння ім службовага абавязку.

Асаблівая ўвага ўдзялялася кантролю і аказанню дапамогі арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу. Рэктар, прарэктар і прэфект рэгулярна наведвалі ўрокі, часта бывалі дома ў вучняў. Для арганізацыі такой работы непасрэдна ў час заняткаў у кожным класе прызначаліся дэкурыёны, якія аказвалі настаўнікам дапамогу.

Па месцы жыхарства, за кожнай кватэрай, дзе жылі школьнікі, замацоўваўся з ліку старшакласнікаў дырэктар, які жыў разам з падапечнымі і ажыццяўляў сувязь паміж імі і прэфектам. Бацькі вучняў абавязаны былі ўтрымліваць дырэктара за свой кошт і, акрамя гэтага, даваць яму пэўную плату. У сваю чаргу, дырэктар павінен быў быць узорам паводзін для вучняў, сачыць за тым, каб ніводнай хвіліны дзеці не за-

ставаліся без пэўных заняткаў. Падрабязная інструкцыя прадпісвала кожнаму дырэктару дасканала вывучыць кожнага з даверaных яму вучняў, яго «тэмперамент, стан здароўя, здольнасці, характар, добрыя і дрэнныя схільнасці» [3. С. 451]. Кожны месяц дырэктары падавалі прэфекту падрабязную справаздачу аб здароўі, паводзінах і поспехах сваіх выхаванцаў. Дырэктар быў надзелены паўнамоцтвамі заахвочваць і накладваць спагнанні на дзяцей. Цікава, што не рэкамендавалася выкарыстоўваць меры пакарання ў прысутнасці іншых дзяцей, каб парушальнік не губляў пачуццё ўласнай годнасці. Тым не менш, як адзначалася вышэй, у школе існавалі публічныя пакаранні вучняў.

У цэлым дзейнасць Адукацыйнай камісіі дала штуршок і залажыла асновы новага этапа ў развіцці асветы і культуры. Практычна была зроблена спроба правесці школьную рэформу з улікам дасягненняў еўрапейскай педагагічнай думкі XVIII ст. Дэмакратычныя пераўтварэнні, свецкая арыентаванасць, стварэнне цэнтралізавана арганізаванай сістэмы асветы, увядзенне элементаў гуманізацыі, падрыхтоўка настаўнікаў і іншае дазваляюць даваць высокую ацэнку дзейнасці першага міністэрства народнай асветы. Не выпадкова, што пасля поўнага ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі навучальныя ўстановы Беларусі не падпарадкоўваліся афіцыйнаму расійскаму «Статуту» 1804 г. Тут быў распрацаваны асобны «Статут, або Агульныя пастановы Віленскага універсітэта і вучылішчаў яго акругі» (1803), а таксама «Прадпісанне па арганізацыі вучылішчаў у акрузе імператарскага Віленскага універсітэта» (1804), якія грунтаваліся на Статуце, інструкцыях і практычных дасягненнях дзейнасці Адукацыйнай камісіі.

Аднак, як падкрэсліваюць даследчыкі, не ўсё задуманае камісіяй здзейснена ў час рэфарміравання сістэмы адукацыі. Палітычнае і эканамічнае становішча Рэчы Паспалітай не магло забяспечыць ні фінансава, ні арганізацыйна ўсіх мерапрыемстваў Адукацыйнай камісіі. Адна з прычын няўдач — адсутнасць настаўніцкіх кадраў, якія б падзялялі намеры рэфарматараў і здолелі б іх ажыццявіць. У сваю чаргу, як слушна адзначалі яшчэ рускія вучоныя XIX ст., сам Статут не заўсёды аб'ектыўна ўлічваў існуючыя рэаліі, а часам утрымліваў палажэнні, выкананне якіх давала вынікі зусім адваротныя задуманым. Так, дэклараваная адзіная бессаслоўная сістэма адукацыі з-за рэальнага становішча ніжэйшых слаёў грамадства і той ступені падтрымкі з боку дзяржавы практычна не адбылася. Таксама вельмі складана было на высокім узроўні забяспечыць прапануемую шматпрадметнасць зместу навучання. Абвешчаная выхаваўчая скіраванасць адукацыі з-за падпарадкавання яе нацыянальна-палітычным амбіцыям зводзілася на месцах да фарміравання нацыянальнай пыхлівасці, высакамерна-ганарлівага стаўлення да іншых народаў. Пабудова навучальна-выхаваўчага працэсу на суцэльным кантролі, наглядзе і ўзаемакантролі часта прыводзіла да склок, сварак, нервова-напружанай абстаноўкі ў школах.

Тым не менш вопыт першага міністэрства народнай асветы ў справе радыкальнага рэфарміравання асветы адыграў важную ролю і як этап развіцця школы і педагагічнай думкі ў межах яго дзейнасці, і як узор для выкарыстання іншымі. Не страціў свайго значэння ён і ў наш час. У прыватнасці, дэталёвае яго вывучэнне і асэнсаванне дапаможа забяспечыць эфектыўнасць рэфарміравання школы на сучасным этапе.



**Літаратура**

1. **Асвета і педагагічная думка ў Беларусі:** Са старажытных часоў да 1917 г. Мн.: Народная асвета, 1985.

2. **Историческій обзоръ деятельности Виленского учебнаго округа** за періодъ его существованія 1803 г. — 1832 г. Отделъ первый 1803 г. — 1824 г. / Составитель Ю. Ф. Крачковский. Вильна: Типогр. А. Г. Сыркина, 1908.

3. **Крыжановский Е.** Учебныя заведенія в рускихъ областяхъ Польши въ періодъ ея разделовъ // Киевская старина. Киев: Типогр. Г. Т. Корчакъ-Новицкого, 1882. Т. 1.

4. **Нарысы народнай асветы и педагагічнай думкі ў Беларусі.** Мн.: Народная асвета, 1968.

5. **Очерки истории науки и культуры Беларуси IX — начала XX в.** / П. Т. Петриков, Д. В. Караев, А. А. Гусак и др. Мн.: Наука и техника, 1996.

6. **Pierwiastkowe przepisi pedagogiezne Komisji Edukacji Narodowej z lat 1773—1776.** Lublin. 1923.